Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Кафедра беларускай і рускай моў

А. С. Качан, А. А. Носік

# АКТУАЛЬНЫ СТАН КРЫНІЦ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ ЛЕКСІКІ НА РОЗНЫХ УЗРОЎНЯХ АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ

Мінск 2025

Вывучэнне медыцынскай лексікі на беларускай мове не ўяўляецца магчымым без вучэбных дапаможнікаў, якія ў сваім складзе знайшлі рацыянальнае спалучэнне тэарэтычнага матэрыялу і змястоўнай формы. Вывучэнне лексікі займае адно з ключавых месцаў у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых урачоў. Аналіз дапаможнікаў на прадмет лексікі (тэрміналогіі) патрабуе комплекснага падыходу ў разглядзе як тэарэтычнага, так і практыка-арыентаванага аспектаў.

Упершыню вучні, магчыма, будучыя медыкі, знаёмяцца з беларускамоўнай анатамічнай тэрміналогіяй на занятках па медыцынскай падрыхтоўцы ў 10 класе [1, с. 32]. Вучэбны дапаможнік «Медыцынская падрыхтоўка» для X–XI класаў устаноў сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання (аўтары: І. М. Новік, Н.К. Калян, Ж.Э. Мазец) складаецца з шасці раздзелаў: «Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках», «Лекавыя прэпараты і расліны», «Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхавання», «Агульны догляд хворых і паражоных», «Першая дапамога пры захворваннях», «Інфекцыйныя захворванні» [2].

У вучэбным дапаможніку захоўваецца комплексны падыход да вывучэння медыцынскай тэрміналогіі. Кожная тэма пачынаецца з пастаноўкі праблемнага пытання, якое актывізуе мысліцельную дзейнасць школьнікаў і падводзіць да вывучэння новага матэрыялу (напрыклад: *Якую галоўную функцыю выконвае павязка ў выпадку пашкоджання цэласнасці скуры?*). Пры вывучэнні тэмы «Захворванні органаў страравання: вострая пячоначная коліка; прафілактыка захворванняў органаў стрававальнай сістэмы» тлумачацца значэнні такіх тэрмінаў і паняццяў, як *печань, вострая пячоначная коліка, жоўць, жоўцевы пузыр*. Школьнікі атрымліваюць базавыя веды пра функцыі жоўці і печані, хімічны састаў жоўці, прычыны ўзнікнення пячоначнай колікі і жоўцекамянёвай хваробы.

Падчас разгляду тэмы «Перавязачны матэрыял» вывучаюцца не толькі асноўныя тэрміны і паняцці (*перавязачны матэрыял, перавязачныя сродкі, павязка – асептычная (засцерагальная), антысептычная (лекавая), сціскальная*), але і назвы частак цела чалавека (*галава, кісць, ступня, перадплечча, галёнка*). Наяўнасць малюнкаў, схем, табліц спрыяе візуалізацыі матэрыялу і больш эфектыўнаму запамінанню тэрміналогіі.

Плённай працай выкладчыкаў беларускай мовы ў медыцынскіх навучальных установах нашай краіны, падрыхтаваны і выдадзены шматлікія вучэбна-метадычныя дапаможнікі для будучых урачоў.

Дапаможнік «Беларуская мова: прафесійная лексіка» (аўтары: Т.В. Кітаева, Н.В. Ратынская, БДМУ) складаецца з некалькіх частак, кожная з якіх суадносіцца з тэматычным планам вучэбных заняткаў і ўтрымлівае элементы граматыкі, пэўны мінімум тэрміналагічнай лексікі і практыкаванні

для замацавання граматычнага і лексічнага матэрыялу. Асобная роля адводзіцца станаўленню медыцынскай тэрміналогіі і асноўным напрамкам у развіцці анатамічнай і клінічнай тэрміналогіі [3].

Для студэнтаў 1 і 2 курсаў стаматалагічнага факультэта, якія ў рамках курса агульнагуманітарных дысцыплін вывучаюць прадмет «Беларуская мова: прафесійная лексіка», прызначаны вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова: стаматалагічная тэрміналогія» (аўтары: А.А. Носік, Н.В. Ратынская, Н.У. Чайка, БДМУ) [4]. Дапаможнік складаецца з 6 тэм (модуляў). У кожнай тэме змяшчаюцца тэксты стаматалагічнага профілю на беларускай і рускай мовах, паслятэкставыя заданні і практыкаванні па тэрміналогіі. Асабліва важнымі з'яўляюцца заданні, якія накіраваны на адпрацоўку лексічных навыкаў (складанне дыялогаў, пастаноўку пытанняў да тэксту, утварэнне тэрмінаў) і навыкаў практычнага выкарыстання анатамічнай і клінічнай тэрміналогіі (вядзення зносін на беларускай мове ў прафесійнай сферы, выступлення з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі). Для больш трывалага авалодання прафесійнай лексікай, а таксама агульнымі ведамі па спецыяльнасці ў дадатковай частцы дапаможніка змешчаны навукова-папулярныя і навукова-вучэбныя тэксты.

У вучэбна-метадычным дапаможніку «Беларуская мова» для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў медыцынскіх ВНУ (аўтар Т.А. Карніеўская, ГомДМУ) разглядаюцца характэрныя рысы беларускага правапісу, у тым ліку запазычанай лексікі, асаблівасці паходжання і развіцця тэрмінаў, а таксама сістэмныя адносіны ў медыцынскай тэрміналогіі. Лексіка разглядаецца у сукупнасці са стылістыкай, што дае магчымасць студэнтам у будучым адбіраць моўныя сродкі адпаведна зместу, стылю, жанру выказвання [5].

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова: прафесійная лексіка» (аўтары: В.В. Невядомская, Г.В. Пржэвальская, ВДМУ) прызначаны для падрыхтоўкі да заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка», будзе запатрабаваны ў студэнтаў 1 курса лячэбнага, стаматалагічнага і педыятрычнага факультэтаў. Складаецца з 5 (модуляў), у адным з якіх падрабязна падаецца класіфікацыя лексічнай сістэмы беларускай мовы, аднак адсутнічаюць практыкаванні для замацавання тэарэтычнага матэрыялу [6].

Дапаможнік «Беларуская мова. Прафесійная лексіка для медыкаў» (аўтар В.І. Варанец, ГрДМУ) прызначаны для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях профілю адукацыі «Ахова здароўя». Дапаможнік уключае звесткі пра мову, шляхі яе паходжання, развіцця і станаўлення. Вялікае месца адводзіцца пытанням беларускай медыцынскай тэрміналогіі. Падаюцца руска-беларускі і беларуска-рускі перакладныя слоўнікі, якія

могуць быць выкарыстаны студэнтамі пры падрыхтоўцы да напісання пісьмовых работ [7].

Для эфектыўнага засваення медыкамі новай лексікі ў большасці вышэй пералічаных дапаможнікаў выкарыстоўваюцца спецыяльна падабраныя лексічныя практыкаванні: пераклад прафесійных тэкстаў, падбор слоў да прапанаваных дэфініцый, падстаноўка прапушчаных слоў у сказы, завяршэнне незакончаных сказаў і інш. Прапануюцца таксама прафесійныя тэксты, якія дапамагаюць не толькі знаходзіць тэрміны, але і тлумачыць іх семантыку.

Для замацавання новага лексічнага матэрыялу прадугледжаны трэніровачныя тэсты, а пракантраляваць якасць засваення пройдзенага матэрыялу дазваляюць кантрольныя тэсты адкрытага і закрытага тыпаў.

Аўтары дапаможнікаў спалучаць пісьмовыя заданні з вуснымі (адказы на пастаўленыя пытанні, пераказ тэкставых урыўкаў і інш.), паколькі разам яны садзейнічаюць трэніроўцы доўгатэрміновай памяці. Матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў якасці асноўнай літаратуры пры вывучэнні курса «Беларуская мова: прафесійная лексіка», а таксама будуць карыснымі для ўсіх, хто цікавіцца беларускай медыцынскай лексікай.

Літаратура

1. Качан, А. С. Вывучэнне анатамічнай тэрміналогіі на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ў медыцынскіх агульнаадукацыйных установах / А. С. Качан // Мова і літаратура: матэрыялы 81-й навук. канф. студэнтаў і аспірантаў філалагічнага фак. БДУ, Мінск, 24 крас. 2024 г. / Беларус. дзярж. у-т, Філалагічны фак. ; рэдкал.: Г. У. Навумава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2024. – 356 с. С. 30–34

2. Новік, І. М. Медыцынская падрыхтоўка: вучэб. дапам. для 10–11 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. М. Новік, Н. К. Калян, Ж. Э. Мазец. − Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2020. – 240 с.

3. Качан, А. С. Вывучэнне анатамічнай тэрміналогіі на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ў медыцынскіх агульнаадукацыйных установах / А. С. Качан // Мова і літаратура: матэрыялы 81-й навук. канф. студэнтаў і аспірантаў філалагічнага фак. БДУ, Мінск, 24 крас. 2024 г. / Беларус. дзярж. у-т, Філалагічны фак. ; рэдкал.: Г. У. Навумава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2024. – 356 с. С. 30–34

4. Носік, А. А. Беларуская мова: стаматалагічная тэрміналогія : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Носік, Н. В. Ратынская, Н. У. Чайка. – Мінск : Беларус. дзярж. мед. ун-т, 2020. – 103 с.

5. Карніеўская, Т. А. Беларуская мова : вучэб.-метад. дапам. / Т. А. Карніеўская. – Гомель : Гомел. дзярж. мед. ун-т, 2014. – 56 с.

6. Невядомская, В. В. Беларуская мова: прафесійная лексіка : вучэб.-метад. дапам. / В. В. Невядомская, Г. В. Пржэвальская. – Віцебск : Віцеб. дзярж. мед. ун-т, 2023. – 283 с.

7. Варанец, В. І. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для медыкаў : вучэб. дапам. / В. І. Варанец. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2018. – 129 с.